# *ДЗЕЙНАСЦЬ ТЭАТРАЛЬНЫХ І МУЗЫЧНЫХ УСТАНОЎ БЕЛАРУСІ ПА АЖЫЦЦЯЎЛЕННІ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ, ПРЫСВЕЧАНЫХ 60-годдзю ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ І 60-годдзю ПЕРАМОГІ САВЕЦКАГА НАРОДА Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ*

*(Па матэрыялах перыядычнага друку)*

Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь надавала-ся вялікая ўвага рэалізацыі планаў мерапрыемстваў па святкаванні 60-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямец-ка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

9 верасня 2003 г. у Мінску адбылося сумеснае пася-джэнне калегій міністэрстваў культуры Рэспублікі Бела-русь і Расійскай Федэрацыі. На парадак дня быў вынесены план мерапрыемстваў па святкаванні гэтых знамянальных дат. У пасяджэнні бралі ўдзел: старшыні калегіі, міністры культуры Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі Л. Гу-ляка і М. Швыдкой, члены калегіі абодвух міністэрстваў, міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь У. Русакевіч, прадстаўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Бела-русь, органаў дзяржаўнага кіравання, Пастаяннага камітэ-та Саюзнай дзяржавы, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь А. Блахін, кіраўнікі арганізацый рэспубліканскага падпарадкавання сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, стар-шыні творчых саюзаў.

Нацыянальныя аргкамітэты па падрыхтоўцы святкаван-ня 60-гадовага юбілею вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 60-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ўзначальвалі Прэзідэнт Рэспублікі Бела-русь А. Лукашэнка і Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі У. Пуцін. Галоўныя мэты прапанаваных мерапрыемстваў – уславіць сродкамі мастацтва подзвіг савецкіх людзей у Вя-лікай Айчыннай вайне, прадэманстраваць духоўныя дасяг-ненні іх нашчадкаў.

У аснову планавання і правядзення Міністэрствам куль-туры творчых і культурна-масавых юбілейных мерапрыем-стваў з нагоды 60-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялі-кай Айчыннай вайне пакладзены рашэнні Рэспубліканска-га арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемстваў, прысвечаных святкаванню 60-годдзя вы-звалення Беларусі і Вялікай Перамогі, адпаведныя дару-чэнні кіраўніка дзяржавы, Савета Міністраў. Міністэр-ствам культуры распрацавана галіновая праграма юбілей-ных мерапрыемстваў, створаны ведамасны аргкамітэт, су-месна з Міністэрствам культуры і

масавых камунікацый Расійскай Федэрацыі зацверджаны адпаведны план.
Ва ўсіх абласцях таксама былі распрацаваны планы падрыхтоўкі і правядзення юбілейных мерапрыемстваў на 2004–2005 гг.
Сярод святочных мерапрыемстваў, якія былі заплана-ваны Міністэрствам культуры да 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 60-годдзя Пе-рамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, – пра-вядзенне Міжнароднага музычнага фестывалю "Мінская вясна", тэматычны паказ у тэатрах рэспублікі спектакляў, прысвечаных знамянальным датам, канцэрты майстроў мастацтваў і г.д.
Тэма Вялікай Айчыннай вайны гучала пры правядзенні такіх маштабных культурных акцый, як Міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску", І Міжнародны фестываль тэатральнага мастацт-ва "Панарама". Падрыхтаваны да выдання зборнік "Бела-руская і расійская драматургія – 60-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне] "73].

## *Тэатральнае мастацтва*

Вясной 2004 г. былі падведзены вынікі *Рэспубліканска-га конкурсу п'ес для тэатра пад дэвізам "Дзень Перамо-гі"*, абвешчанага Міністэрствам культуры да 60-годдзя вы-звалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На конкурсе былі прадстаўлены 44 творы 36-ці аўтараў. Сярод лепшых – п'есы А. Дзяленздзіка, А. Паповай, С. Бартоха-вай, В. Паніна і інш. Усе адзначаныя ўзнагародамі творы рэкамендаваны да пастановак у тэатрах краіны [25].
14–23 кастрычніка 2004 г. у Мінску адбыўся *І Міжна-родны тэатральны фестываль "Панарама"*, які праходзіў пад дэвізам "Тэатр супраць насілля" і быў прысвечаны
60-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх за-хопнікаў і 60-годдзю Вялікай Перамогі. На фестывалі прадстаўлены ўсе тэатральныя напрамкі, як традыцыйныя, так і эксперыментальныя. Удзел у фестывалі прымалі твор-чыя калектывы з Расіі, Украіны, Латвіі, Літвы, Польшчы, Славеніі, Францыі і ЗША. Нашу краіну прадстаўлялі На-цыянальны акадэмічны тэатр імя Я. Купалы, Тэатр-студыя кінаакцёра, Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я. Коласа, Гомельскі абласны драматычны тэатр. У рамках тэатральнага фестывалю прайшлі "круглыя сталы", майстар-класы, навукова-практычныя канферэнцыі, семі-нары з удзелам тэатразнаўцаў.

Да 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысц-кіх захопнікаў і 60-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне дзяржаўныя тэатры краіны ўключылі ў рэпертуар-ныя планы пастаноўкі спектакляў, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Сярод іх – творы В. Быкава,
А. Макаёнка, А. Дударава, А. Паповай, А. Фадзеева, Б. Ва-сільева, А. Твардоўскага і іншых аўтараў.
З 28 красавіка па 5 мая 2005 г. у Маскве праходзіў
*VII Міжнародны тэлевізійна-тэатральны фестываль "Этот День Победы…"*, прысвечаны 60-годдзю Вялікай Пе-рамогі. Усяго ў святочным мерапрыемстве прымалі ўдзел каля 20-ці тэатраў з Масквы, Севастопаля, Кіева, Адэсы, Керчы, Тулы, Мурманска, Смаленска, а таксама беларускія калектывы.
Драматычны тэатр Беларускай арміі прадставіў спек-такль *"Ты помніш, Алёша…"* А. Дударава, Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі – *"Трыбунал"* А. Макаёнка, Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горка-га – *"Случайный вальс"* па сцэнарыю Б. Луцэнкі. Былі па-казаны дзве пастаноўкі паводле твораў В. Быкава: *"Балада пра каханне"* Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя
Я. Купалы (паводле "Альпійскай балады") і *"Мост"* Брэсц-кага абласнога тэатра драмы і музыкі (паводле твора "Круг-лянскі мост").
Беларускія ўдзельнікі атрымалі шэраг прэстыжных узнагарод: *А. Дудараў* – за стварэнне арыгінальных драма-тычных твораў *"Ты помніш, Алёша…"* і *"Не пакідай мяне"*; акцёры *Я. Нікіцін* (Камкор, *"Ты помніш, Алёша…"*) і
*В. Ласоўскі* (Цярэшка Калабок, *"Трыбунал"*) – за таленаві-тае выкананне мужчынскай ролі; *Т. Мархель* (Паліна, *"Трыбунал"*), *Г. Хітрык* (Джулія, *"Балада пра каханне"*) – за таленавітае выкананне жаночай ролі; *А. Козак* (*"Мост"*) – за рэжысёрскае майстэрства ў тэатры; *Б. Луцэнка* і *У. Арлоў* (*"Случайный вальс"*) – за стварэнне лепшага спектакля ў тэатры. *Б. Луцэнка* і *М. Дударава* атрымалі ордэны М. Ла-маносава, а *У. Арлоў* – ордэн святога князя А. Неўскага
II ступені [1, 40, 60].

На *XII Міжнародным фестывалі "Славянскія тэат-ральныя сустрэчы-2004"*, які адбыўся ў г. Бранску (Расія), безумоўным лідэрам быў спектакль *"Радавыя"* па п'есе
А. Дударава Гомельскага абласнога драматычнага тэатра ў пастаноўцы В. Раеўскага, які напярэдадні 60-годдзя Вялі-кай Перамогі звярнуўся да нашай агульнай славянскай гіс-торыі – барацьбе з нямецка-фашысцкімі

захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Цэласны і магутны ў сваім драматызме спектакль стаў сапраўдным гімнам славянскай еднасці. Выдатныя акцёрскія работы, зладжаны ансамбль, яркая і вобразная сцэнаграфія, і галоўнае – высокі грама-дзянскі патрыятызм і любоў да свайго народа, сваёй зямлі і свайго агульнага гераічнага мінулага, – усё гэта вызначы-ла высокую ацэнку як з боку журы, так і фестывальнага гледача. Спектакль "Радавыя" Гомельскага абласнога дра-матычнага тэатра атрымаў вышэйшую ўзнагароду – Гран-пры фестывалю. Мастак Б. Герлаван атрымаў Спецыяльны прыз губернатара Бранскай вобласці Ю. Лодкіна за яркую і адмысловую сцэнаграфію [36].

У студзені 2005 г. у Гомелі прайшоў *II абласны фес-тываль творчай тэатральнай моладзі.* Ініцыятарам і ар-ганізатарам мерапрыемства выступіла ўпраўленне культу-ры Гомельскага аблвыканкома, і прысвечаны ён быў 60-год-дзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Цікавыя вынікі дала новая намінацыя фестывалю – сольны літаратурны вечар, літаратурны спектакль. Маладыя артысты Гомель-скага абласнога драматычнага тэатра паказалі літаратурны спектакль *"З чаго пачынаецца Радзіма?"* у пастаноўцы
А. Бычкова. Гэта ўсхваляваны аповед іх равеснікаў пра салдат, якія пайшлі ў мінулае не адчуўшы жыцця ў поў-ную моц. У сваёй намінацыі гэты спектакль прызнаны леп-шым. Сваімі літаратурнымі праграмамі парадавалі артысты Гомельскага гарадскога эксперыментальнага маладзёжнага тэатра-студыі, у выкананні якіх прагучалі творы М. Цвя-таевай, І. Бродскага, Б. Ахмадулінай, Ф. Дастаеўскага.
Сярод узнагароджаных – артыст Гомельскага эксперы-ментальнага маладзёжнага тэатра-студыі *Дз. Мядзведзеў*, які ўдастоены дыплома за лепшую мужчынскую ролю ў спектаклі *"Такая доўгая навальніца" С. Бартохавай.* У гэтым жа спектаклі работа *Л. Астрахавай* прызнана леп-шай жаночай роляй, а дыпломам за творчы пошук узнага-роджаны артыст *У. Цітоў*.
Нацыянальны характар беларускай жанчыны, якая ўмее быць не толькі памяркоўнай, але і валявым чалавекам, які любіць сваю Радзіму, стварыла артыстка *А. Чыжык* у спек-таклі Мазырскага драматычнага тэатра імя І. Мележа *"Тры-бунал"* па п'есе А. Макаёнка (рэжысёр Р. Цыркін), за што была ўдастоена дыплома журы за лепшую жаночую ролю. У гэтым жа спектаклі дыпломам за ўдалае ўвасабленне ролі адзначаны артыст *А. Савіцкі* [51].
Дарэчы, звярнуўшыся да тэмы Вялікай Айчыннай вай-ны ў спектаклі "*Трыбунал*", Мазырскі драматычны тэатр імя І. Мележа выказаў тым

самым непадробную цікавасць і важнасць асэнсавання ўласнага мінулага, трагічнай і ге-раічнай гісторыі беларускага народа. Спектакль, прадстаў-лены гледачам, пакарыў сваёй шчырасцю і вастрынёй асэн-савання і сцэнічнага ўвасаблення гэтай вядомай п’есы. Спектакль ставіць нас перад фактам: вайна не абыходзіцца “малой крывёю”, яна “падмінае” пад сябе ўсіх [33].

24 чэрвеня 2004 г. на сцэне Цэнтральнага Дома афі-цэраў адбыўся прэм’ерны паказ спектакля “*Ты помніш, Алёша...*” па новай п’есе А. Дударава, створанай да 60-год-дзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопні-каў. З гэтага спектакля пачалося жыццё новага тэатра – Драматычнага тэатра Беларускай арміі, мастацкім кіраўні-ком якога з’яўляецца Аляксей Дудараў. Спектакль прысве-чаны абароне г. Магілёва ў першыя тыдні пасля пачатку вайны. Гэта была, па-сутнасці, першая перамога Савецкай Арміі ў Вялікай Айчыннай вайне, калі амаль на месяц была затрымана адладжаная, непераможная па тых часах армія вермахта, што з’яўлялася тады практычна немагчы-мым. П’еса А. Дударава “Ты помніш, Алёша...” – даніна памяці мужным абаронцам горада, сваёй Айчыны. Дарэчы, назва п’есы ўзята з першых радкоў верша К. Сіманава, для якога г. Магілёў і Буйніцкае поле сталі адметнай вехай усяго жыцця.
Выдатна працуе ў спектаклі артыст Я. Нікіцін. Глядач упэўнены, што яго герой – адтуль, з гэтага поля, з таго страшнага, складанага часу. Таленавіта, з багатым унутра-ным светам выконвае сваю ролю маладая актрыса Я. Жу-ковіч. Запамінальныя вобразы ствараюць І. Пятроў, І. Філь-чанкоў і іншыя артысты. Рэжысёр спектакля – М. Дудара-ва. Рэпертуар Драматычнага тэатра Беларускай арміі будзе будавацца на магутных асобах, моцных і сур’ёзных пачуц-цях. Мэта тэатра – выхаванне патрыятызму шляхам пака-зу славутых старонак гісторыі краіны праз святло духоў-насці. Сваімі гледачамі тэатр бачыць людзей рознага ўзро-сту – ад школьнікаў да ветэранаў [14, 15, 27, 28, 48, 78].
Паводле вядомага твора В. Быкава “Альпійская бала-да” да знамянальнай даты на сцэне Нацыянальнага акадэ-мічнага тэатра імя Я. Купалы быў пастаўлены спектакль “*Балада пра каханне*”. У сваёй працы рэжысёр У. Савіцкі пайшоў самастойным шляхам, пазбягаючы падабенства і параўнання са знакамітым кінафільмам, які сёння ўвахо-дзіць у “залатую калекцыю” стужак пра Вялікую Айчын-ную вайну. Спектакль купалаўцаў прадстае перад намі са-мастойным і самадастатковым творам мастацтва. Сапраўд-ным тэатральным адкрыццём стала ігра маладых акцёраў Г. Хітрык (Джулія) і Р. Падаляці

(Іван). У спектаклі “Ба-лада пра каханне” яны ці не ўпершыню для сябе прадсталі ў ролях “несучаснікаў”, людзей з той далёкай вайны. Але ж выканаўцы здолелі зрабіць іх блізкімі і нават роднымі нам.
Маладыя артысты зрабілі гэта найперш шчырасцю перажыванняў і тонкасцю ўзаемаадносін, якія ўзнікаюць паміж іх героямі. Яны здолелі паказаць не бруд вайны, а яе чысты твар, якім ва ўсе часы з’яўляліся і з’яўляюцца людзі з палкімі і адкрытымі сэрцамі, са шчырымі эмоцыя-мі і чалавечымі ўчынкамі. Менавіта пра гэта і распавядае спектакль [20, 29, 32].
Артыст-купалавец Г. Аўсяннікаў сумесна з рэжысёрам У. Савіцкім зрабілі монаспектакль паводле паэмы А. Твар-доўскага “*Василий Теркин*”, які прысвяцілі 60-годдзю Вя-лікай Перамогі. Мы бачым перад сабой вялікую вайну і сціплы чалавечы лёс, бачым подзвіг чалавечага жыцця без падману. У выкананні акцёра няма ні адзінай фальшывай ноты, прафесійных штампаў. З дапамогай тэатральнага мас-тацтва моладзь адкрывае для сябе новыя ісціны, новыя пачуцці [45].
Сярод існуючых сучасных акцёрскіх школ, шматлікіх выканальніцкіх манер прапанаванае Г. Аўсяннікавым – адно з самых складаных. Яго выкананне пазбаўлена ўсяля-кай натужнасці, моцных пачуццяў напаказ, відавочных акцёрскіх высілкаў. Артыст не хаваецца за штучныя рэ-жысёрскія прыдумкі, спакойна размяркоўвае акцэнты.
Г. Аўсяннікаў авалодвае вершаванай стыхіяй рытму, пад-парадкоўваецца паэтыцы твора, проста вылучае і ў патрэб-ны момант падкрэслівае змест, сэнс. Менавіта ў прастаце выканання, у множнасці магчымых псіхалагічных нюансаў – сакрэт майстэрства акцёра, які немажліва пераняць, як пе-раняць саму душу [23].

Дырэктару Гомельскага абласнога драматычнага тэатра В. Рагоўскай належыць ідэя стварэння *канцэртнай брыга-ды*, у склад якой уваходзяць акцёры абласнога драматыч-нага тэатра, выкладчыкі і студэнты каледжа мастацтваў імя Н. Сакалоўскага, артысты абласной філармоніі. Удзель-нікі канцэртнай брыгады расцэньваюць сваю дзейнасць і як даніну памяці сваім калегам, артыстам першай беларус-кай франтавой брыгады, і як уклад у святочныя мерапры-емствы, прысвечаныя 60-годдзю Вялікай Перамогі.

У красавіку 2005 г. на сцэне Нацыянальнага акадэміч-нага драматычнага тэатра імя М. Горкага адбылася прэм’е-ра спектакля “*Случайный вальс*”, сцэнарый якога стварыў мастацкі кіраўнік тэатра Б. Луцэнка, вызначыўшы яго жанр як “зримая песня”. Пастаноўку ажыццявіў

рэжысёр У. Арлоў. Ствральнікі спектакля адмовіліся ад звычайнай драматургічнай асновы, вызначаючы гэтым пошук новага падыходу да раскрыцця тэмы вайны. Б. Луцэнка і У. Арлоў прапрацавалі вялікі пласт франтавой літаратуры, і калі ўзнікала адчуванне, што закранутая тэма хвалявала, зна-ходзіла водгук у сэрцах, аўтары бралі яе. У аснову драма-тургічнай структуры спектакля пакладзены не толькі пес-ні, але і шэраг асэнсавана-прааналізаваных лістоў з фрон-ту, успаміны відавочцаў, а таксама літаратурныя матэры-ялы. "Зримая песня" – гэта песня, што мае сюжэт, які кожны чалавек можа трактаваць па-свойму [35, 40].

Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Гор-кага, Мінскае аб'яднанне арганізацый прафсаюзаў і Адмі-ністрацыя Маскоўскага раёна г. Мінска – даўнія партнёры ў правядзенні супольных культурных акцый, скіраваных на патрыятычнае і духоўнае выхаванне моладзі, адраджэн-не духоўных і маральных традыцый у грамадстве, падтрым-ку і развіццё нацыянальнай культуры. Нядаўна ажыццёў-лены сумесны праект, назву якому даў радок вядомай пес-ні: "...И память сердца говорит". Часткай гэтай дабрачын-най акцыі з'явіўся паказ для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны спектакля "Случайный вальс] "35, 59].

1 ліпеня 2004 г., напярэдадні свята 60-годдзя вызва-лення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у Тэ-атры-студыі кінаакцёра адбылася прэм'ера кінаспектакля "*Навечна ў памяці*", пастаноўку якога ажыццявілі рэ-жысёры А. Бяспалы і У. Грыцэўскі. У пастаноўцы выдатна спалучаюцца кіно і музыка, проза і паэзія. У спектакль уключаны фрагменты твораў, добра вядомых у народзе: "Альпійская балада" ,"Гадзіннік спыніўся апоўначы" ,"Дзяржаўная мяжа". Пастаноўшчыкі спектакля вызначылі сваёй мэтай пра-сачыць за падзеямі вайны ад пачатку да канца, паказаць тых простых, але і гераічных людзей, якія выратавалі ча-лавецтва ад фашызму [11, 19].

Да 60-годдзя Вялікай Перамогі Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі паставіў п'есу А. Макаёнка "*Тры-бунал*", якая ужо з'яўляецца класікай беларускай драма-тургіі XX ст. Пастаноўку ажыццявілі В. Анісенка, В. Рас-стрыжэнкаў. Выдатна выконвалі свае ролі В. Ласоўскі,
Т. Мархель, А. Дабравольскі, В. Багушэвіч. Ствральнікі спектакля здолелі данесці да гледача трагічнасць падзей ваеннага часу, якія па-сапраўднаму кранаюць сэрцы на-шых сучаснікаў [68].

Сёння думаецца, ці не адлюстравана ў вобразе Калабка сапраўдная

Асоба беларуса – рахманага, ціхага чалавека, але здольнага змагацца з тым, што ён ненавідзіць. Дзя-куючы выразнаму акцёрскаму выкананню і тонкаму псіха-лагічнаму партнёрству выканаўцаў тэатру ўдалося данесці гледачу, што сіла краіны – сям'я, якая падчас вайны ста-навілася смяротнай зброяй супраць фашызму.
Не так часта ў мінскіх тэатрах можна ўбачыць спек-таклі з дакладна вызначаным сацыяльным зместам. У гэ-тай жа пастаноўцы выразна акрэслены яшчэ і гуманістыч-ны сэнс. Усе перыпетыі спектакля надзвычай кранаюць гледачоў, а трагічны фінал – узрушае.
Дарэчы, сёння мастацкі кіраўнік тэатра В. Анісенка рыхтуе п'есу А. Макаёнка "Трыбунал" на сцэне Іркуцкага Тэатра юнага гледача імя А. Вампілава, ставячы мэтай да-несці да расійскага гледача тонкасці і асаблівасці беларус-кага нацыянальнага характару [5, 24].

6 кастрычніка 2004 г. Нацыянальны акадэмічны дра-матычны тэатр імя Я. Коласа адкрыў тэатральны сезон прэм'ерным паказам спектакля "*Плошча Перамогі*" па п'есе А. Паповай, які прысвяціў 60-годдзю Вялікай Пера-могі. Пастаноўшчык спектакля мастацкі кіраўнік тэатра В. Баркоўскі лічыць, што ў драматургічным тэксце зана-тавана моцная стваральная энергія, распрацавана вельмі складаная партытура адносін паміж персанажамі. Заклік аўтара да павагі, веры ў прызначэнне чалавека як носьбіта свайго часу – асноўнае ў п'есе, што падштурхнула рэжысё-ра да сцэнічнай размовы з гледачом [9, 26].

У Новым драматычным тэатры да знамянальнай даты малады рэжысёр Д. Нупрэйчык паставіў спектакль *"Не бойся быть счастливым"* паводле п'есы А. Арбузава "Мой бедный Марат".

27 чэрвеня 2004 г. у Магілёўскім абласным тэатры дра-мы і камедыі імя В.І. Дуніна-Марцінкевіча прайшло свята, прысвечанае 60-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у рамках якога адбылася прэм'ера спектакля па п'есе М. Манохіна *"Бабруйскі кацёл"*. Рэжы-сёр пастаноўкі – У. Унукаў [12, 37].
.
Юбілей Вялікай Перамогі ў вайне з фашызмам – па-дзея асаблівая, якая прайшла праз сэрцы і лёс кожнага, хто жыве ў Беларусі. І зразумела жаданне зрабіць спек-такль незвычайны, які не нагадвае чужыя трафарэты. Ма-гілёўскі абласны драматычны тэатр на пачатку сезона 2004/2005 гг., а менавіта 24 верасня 2004 г. паказаў прэм'еру, якая згадваецца з асабліва цёплым пачуццём. Героі спектакля *"Я твая*

*нявеста”* ў пастаноўцы В. Ерань-ковай, зробленага паводле твору В. Астаф’ева, для паста-новачнай брыгады – пакаленне бацькоў, для маладых вы-канаўцаў – пакаленне дзядоў. Вядома, што мастакі доўга знаходзяцца ў палоне сваіх уяўленняў і свайго часу. Але сёння змяніўся погляд на свет, на гісторыю, на існуючыя міфы. Трэба ствараць новую рэальнасць. Сённяшняму па-каленню пра мінулае трэба распавядаць па-іншаму. І тэатр адступіўся ад звыклых стэрэатыпаў. У гэтым спектаклі бачыцца новае светаадчуванне, нават з элементамі раман-тызму. Цікава, што прачытанне прозы вельмі рэалістычна-га пісьменніка В. Астаф’ева здзейснена паэтычнымі срод-камі, якія вельмі блізкія і зразумелыя маладому пакален-ню.
Тэатр захацеў паказаць гледачу прафесійныя сучасныя тэхналогіі, калі паняцце правінцыйнай беднасці знікае, а маладая каманда працуе роўна, і працуе на ідэю: на вайне змагаліся і гінулі незвычайныя, выдатныя людзі, якія вы-расталі з такіх, як мы сёння. Падзеі спектакля спалучаюц-ца ў тонкую ніць чалавечых узаемаадносін і лёсаў [3, 39, 70].

16 кастрычніка 2004 г. у Гродзенскім абласным дра-матычным тэатры адбылася прэм’ера спектакля *“Заўтра была вайна”* па аповесці Б. Васільева ў пастаноўцы
Г. Мушперта [17].

22 кастрычніка 2004 г. прэм’ерай спектакля *“Начало”* па п’есе Б. Васільева адкрыўся 14-ы тэатральны сезон у Мін-скім абласным драматычным тэатры. Рэжысёр – Ю. Вута [42].

У кастрычніку 2004 г. у Дзяржаўным маладзёжным тэ-атры адбылася прэм’ера спектакля *“Лейтенант Володька”* па твору В. Кандрацьева “Отпуск по ранению” ў пастаноў-цы М. Абрамава.

Свой 13-ты тэтральны сезон Гомельскі маладзёжны экс-перыментальны тэатр-студыя пачаў з прэм’еры спектакля па п’есе С. Бартохавай “*Такая доўгая навальніца”* ў паста-ноўцы Р. Таліпава.

Да 60-годдзя Вялікай Перамогі ў Гомельскім абласным драматычным тэатры быў пастаўлены спектакль *“Пайсці і не вярнуцца”* паводле твора В. Быкава. Пастаноўка была здзейснена ў рамках супрацоўніцтва з Цэнтрам падтрымкі рускага тэатра за мяжой, які створаны пры Саюзе тэат-ральных дзеячаў Расіі. Рэжысёр спектакля В. Варэцкі (г. Масква).

## *Музычнае мастацтва*

60-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў быў прысвечаны *Міжнародны музычны фесты-валь “Мінская вясна-2004”*, які прайшоў з 16 па 30 краса-віка 2004 г. У выкананні сімфанічнага аркестра Беларус-кай дзяржаўнай акадэміі музыкі “Маладая Беларусь” і музычнай капэлы “Санорус” прагучала вакальна-сімфаніч-ная паэма Г. Вагнера “Вечно живые”, якая стала класікай нацыянальнай музыкі XX ст. і адным з самых папулярных твораў на патрыятычную тэматыку. У рамках фестывалю адбылася прэм’ера араторыі “Мир дому твоему” кампазіта-ра У. Прохарава паводле твораў А. Вярцінскага, створанай менавіта да гэтай знамянальнай даты. Прэм’еру араторыі падрыхтавала музычная капэла “Санорус” пад кіраўніцт-вам А. Шута.

З 5 красавіка па 9 мая 2005 г. доўжыўся *Міжнародны музычны фестываль “Мінская вясна-2005”*, прысвечаны 60-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Традыцыйнае веснавое свята музыкі немагчыма ўявіць без удзелу маладых выканаўцаў. Урачыстае адкрыц-цё фестывалю адбылося ў абноўленай Вялікай зале Бела-рускай дзяржаўнай філармоніі, дзе таленавітыя беларускія дзеці, стыпендыяты Спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі, выступілі разам з расій-скімі юнымі музыкантамі, якіх падтрымлівае Міжрэгія-нальны дабрачынны грамадскі фонд “Новые имена”. На фестываль былі запрошаны такія вядомыя выканаўцы, як Струнны квартэт імя М. Глінкі (Расія), нямецкі Квартэт саксафонаў, ансамблі “Харошкі“ ,”Свята” і інш.
Ідэя міру і гуманізму аб’яднала серыю канцэртаў *Дзяр-жаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Беларусі*, якія прагучалі ў праграме фестывалю. Новы праект, які атрымаў назву *“И будет помнить мир спасенный…”*, з’явіўся данінай памяці тым, хто аддаў сваё жыццё за Перамогу [10].
Ваенная тэма стала дамінуючай у выступленні сімфа-нічнага аркестра Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі “Маладая Беларусь”.
Два канцэрты (1 і 9 мая) задуманы як дабрачынныя, запрашэнні прызначаліся ветэранам вайны і працы.
Завяршыліся мерапрыемствы Міжнароднага музычнага фестывалю “Мінская вясна-2005” у Дзень Перамогі [3, 21, 66].

Адным з галоўных мерапрыемстваў у дні святкавання юбілею Перамогі стала *Міжнародная грамадска-культур-ная акцыя “Эшелон Победы”*. Яе

ідэя – стварыць святоч-ную атмасферу тых памятных дзён, калі з перамогай вяр-таліся дамоў героі вайны. 6 мая 2005 г. у Мінску ў рамках міждзяржаўнай акцыі адбыўся вялікі гала-канцэрт з удзе-лам расійскіх і беларускіх артыстаў. Адкрыўся канцэрт выступленнем Нацыянальнага акадэмічнага народнага хо-ру Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча, затым выступілі Дзяржаўны ансамбль народнай музыкі "Свята", Дзяржаў-ны народны аркестр імя І. Жыновіча, заслужаны харэагра-фічны ансамбль "Харошкі", творчая група "Чысты голас" і іншыя калектывы. Песні ваенных гадоў і сучасныя папу-лярныя творы прагучалі ў выкананні І. Кабзона (мастацкі кіраўнік праекта), Т. Гвердцытэлі, Р. Ібрагімава, Р. Алях-но, І. Абалян, Н. Багуслаўскай і І. Капланава.

21 снежня 2004 г. у Палацы Рэспублікі адбыўся спра-ваздачны *канцэрт уладальнікаў Гран-пры, стыпендыятаў Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі*, прысвечаны 60-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Новы музычны праект, прысвечаны тым, хто бараніў нашу Радзіму ад ворага ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг., хто верыў у Перамогу і здабыў яе, ахвяраваўшы асабістым жыццём, ажыццявіў *Дзяржаўны канцэртны аркестр Рэспублікі Беларусь* пад кіраўніцтвам народнага артыста краіны, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі, прафесара Міхаіла Фінберга.
Новы праект складаецца з некалькіх праграм. Гэта "Песні Перамогі" – "Сіняя хустачка" ,"Агеньчык" ,"Тры танкісты" і інш. Узбагаціў пераможную песенную палітру цыкл твораў выдатнага музыканта і кампазітара, народна-га артыста СССР і Беларусі У. Мулявіна "Праз усю вайну". Адна з праграм новага праекта зроблена на вершы паэта-франтавіка М. Ясеня. Падрыхтавана і праграма з твораў народнага артыста Беларусі кампазітара А. Багатырова.
Усе праграмы Дзяржаўны канцэртны аркестр Рэспублі-кі Беларусь паказваў на канцэртных пляцоўках малых і вялікіх гарадоў Беларусі. Аўтар ідэі праекта М. Фінберг лічыць, што праз песню, музыку трэба данесці да сённяш-няга пакалення сутнасць гераізму і подзвігу народа, само дыханне эпохі ваеннага ліхалецця, перадаць мастацкімі сродкамі тую веру чалавека ў шчаслівую будучыню, што давала яму сілы падымацца ў атаку, закрываць сабой амбра-зуру дота, ісці на таран варожага самалёта, а яшчэ любіць і чакаць.

18 сакавіка 2005 г. выступленнем у Стоўбцах *Дзяржаў-ны канцэртны аркестр Беларусі* распачаў новы гастроль-ны праект, прысвечаны 60-годдзю Вялікай Перамогі, пад назвай *“Салют Перамогі – малым гарадам”*. З гэтай пра-грамай аркестра пазнаёміліся жыхары Слуцка, Вілейкі, Барысава, Дзяржынска. Стваральнікі праекта змаглі знай-сці тую інтанацыю, якая не казалася фальшывай моладзі і якая знайшла водгук у старэйшага пакалення. У канцэр-тах прымалі ўдзел Н. Тамела, Дз. Качароўскі, Г. Мушак, Г. Грамовіч і інш. [50].

31 чэрвеня 2004 г. пачаліся гастролі *Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь* пад кіраўніцтвам В. Баба-рыкіна па гарадах і вёсках Бацькаўшчыны, прысвечаныя 60-годдзю з дня вызвалення нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. За 15 гастрольных дзён аркестр і яго салісты далі 15 канцэртаў ва ўсіх шасці абласцях краі-ны. Магілёў, Бабруйск, Ліда, Гродна, Віцебск, Салігорск, Барысаў, Брагін, Рэчыца, Гомель, Брэст, Пінск, Мінск – такая геаграфія гастрольнага тура. Акрамя таго, быў да-дзены дабрачынны канцэрт у Рэспубліканскім шпіталі для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны ў Бараўлянах, а такса-ма для выхаванцаў Івянецкага дзіцячага дома. Гастрольны тур пад назвай *“Вызваленню Беларусі-60”* стартаваў з
г. Магілёва, першага абласнога цэнтра Беларусі, вызвале-нага ад ворага 60 гадоў таму.
У праекце было задзейнічана больш за 100 удзельні-каў. Разам з музыкантамі аркестра на сцэне выступалі зор-кі беларускай эстрады, любімыя рознымі пакаленнямі слу-хачоў: Н. Багуслаўская і І. Капланаў, Я. Паплаўская і
А. Ціхановіч, І. Дарафеева, К. Слука, Я. Навуменка,
А. Хлястоў, В. Дземянчук, М. Сапацькоў, саліст Нацыя-нальнага акадэмічнага тэатра оперы У. Громаў, салістка Гомельскай абласной філармоніі Г. Паўлянок і іншыя вя-домыя выканаўцы. Асноўны рэпертуар канцэртаў склалі патрыятычныя песні – як рэтра-шлягеры ваенных і пасля-ваенных часоў, так і сучасныя творы беларускіх кампазіта-раў [54, 75].
Арганізатарамі гэтай творчай акцыі выступілі Кіраў-ніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Міністэр-ства культуры Рэспублікі Беларусь, мясцовыя выканкомы. Адміністратыўныя пытанні вырашала Генеральная дырэк-цыя Палаца Рэспублікі. Дзякуючы прэс-службе Прэзідэнта была ажыццёулена афіцыйная інфармацыйная падтрымка.

*“Майскімі кароткімі начамі...”* – назва праекта, ство-ранага

*Прэзідэнцкім аркестрам Рэспублікі Беларусь* пад кіраўніцтвам В. Бабарыкіна да 60-годдзя Перамогі савецка-га народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Гэта вялікі гастроль-ны тур па ўсёй краіне. Праграму склалі папулярныя мело-дыі мінулых гадоў, песні ваеннага пакалення, новыя творы беларускіх кампазітараў. З аркестрам выступалі такія вя-домыя салісты, як Н. Багуслаўская, Я. Паплаўская і А. Ці-хановіч, Я. Навуменка і інш. Гастролі пачаліся 30 сакавіка 2005 г. і завершыліся святочным канцэртам 9 мая ў Мін-ску.

У сакавіку 2005 г. *Прэзідэнцкі аркестр* правёў у Пала-цы Рэспублікі прысвечаны 60-годдзю Вялікай Перамогі аўтарскі вечар беларускага кампазітара і музыканта В. Га-лаўко, які зараз жыве ў ЗША. Дагэтуль яго музыка ўжо неаднаразова гучала ў выкананні калектыву, выклікаючы вялікі інтарэс з боку публікі. У аўтарскім канцэрце бралі ўдзел вядомыя эстрадныя зоркі: П. Ялфімаў, Н. Падоль-ская, Р. Аляхно і інш. [71].

Напярэдадні Дня Перамогі ў канцэртнай зале "Мінск" адбыўся вечар, прысвечаны Міжнароднаму дню вязняў фа-шысцкіх лагераў і 60-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчын-най вайне. Удзельнічалі ў ім паэтэса В. Паліканіна, Ака-дэмічны ансамбль песні і танца Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь, спевакі Я. Навуменка, І. Краснадубскі, ансамбль народнай музыкі "Бяседа", аб'яднаны хор былых малалет-ніх вязняў канцлагераў і валанцёраў сталічнай сярэдняй школы № 137, дуэт Я. Паплаўскай і А. Ціхановіча, ва-кальная група "Чысты голас", Нацыянальны акадэмічны народны хор імя Г. Цітовіча. Заключным штрыхом прагра-мы была песня І. Лучанка "Память сердца". Арганізатары канцэрта падарылі сапраўдную радасць людзям, якія пера-жылі на сваім вяку страшныя жыццёвыя выпрабаванні [67].

Цыкл канцэртаў, прысвечаных 60-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, даў *Дзяржаў-ны ансамбль танца Беларусі* (мастацкі кіраўнік Валянцін Дудкевіч). Каля палавіны канцэртаў – дабрачынныя. Ся-род спонсараў канцэртаў для ветэранаў – Камітэт па адука-цыі Мінгарвыканкома, "Белинвестбанк", "Минскэнерго" і іншыя арганізацыі.

У маі 2005 г. у Дзяржаўным музычным тэатры адбыў-ся канцэрт паэта-песенніка А. Лягчылава, прымеркаваны да 60-годдзя Вялікай Перамогі і 25-годдзя творчай дзейнас-ці.

Напярэдадні вялікага свята ў Мінску на Кастрычніц-кай плошчы адбыўся канцэрт *“Салют Перамогі”*, арганіза-ваны ўпраўленнем культуры Мінгарвыканкома і аб’яднан-нем “Белканцэрт”. Перад гледачамі выступалі І. Афанась-ева, П. Смолава, групы “Новый Иерусалим“ ,”Тяни-Тол-кай” і інш. Выконваліся не толькі лепшыя кампазіцыі гэ-тых выканаўцаў, але і песні ваенных гадоў.

9 мая 2005 г. каля сцен сталічнай ратушы адбылося свята класічнай музыкі *“А музы не молчат”*. Перад гледа-чамі выступілі хор мужчынскага прыходу “Всех скорбя-щих Радость” – “Радзивиллы”, аркестр баянаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі “Арт-гармоника”, салістка
А. Мілавідава, званары мінскіх храмаў, інструментальны ансамбль народных інструментаў “Флажалет” Дома міла-сэрнасці.
Памяці ўсіх загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны былі прысвечаны пахавальныя перазвоны. Спецы-яльныя перазвоны гучалі для тых, каму ўдалося застацца ў жывых у тыя цяжкія гады.

*Дзяржаўны акадэмічны народны аркестр Беларусі імя І. Жыновіча* да 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў падрыхтаваў тэматычную праграму пад назвай *“Табе, мой родны горад”*. Большую частку прагра-мы складаюць песні беларускіх кампазітараў, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне. Гэта песні І. Любана, У. Алоўні-кава, І. Лучанка, Л. Захлеўнага, У. Мулявіна, І. Каплана-ва. Таксама ў праграму ўключаны фрагменты з оперы
Я. Цікоцкага “Алеся”, напісанай у 1944 г. і прысвечанай партызанскаму руху (рэпетыцыі гэтай оперы пачаліся ў разбураным Мінску літаральна адразу пасля яго вызвален-ня) [69].

У маі 2005 г. у канцэртнай зале Беларускай дзяржаў-най філармоніі адбыўся *справаздачны канцэрт дзіцячых школ мастацтваў*, прысвечаны 60-годдзю Вялікай Пера-могі. У ім прынялі ўдзел стыпендыяты Спецыяльнагна фон-ду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленаві-тай моладзі, лаўрэаты рэспубліканскіх і міжнародных кон-курсаў.

З 25 сакавіка па 1 красавіка 2005 г. праходзіў *Тыдзень музыкі для дзяцей і юнацтва Партызанскага раёна г. Мін-ска.* Мерапрыемства праводзілася ўпершыню і прысвячала-ся 60-годдзю Вялікай Перамогі. Удзел у ім прынялі школь-нікі агульнаадукацыйных школ з эстэтычным ухілам і

му-зычная школа гэтага раёна. У рамках тыдня з канцэртам “Крокі да сэрца” выступіла дзіцячая дабрачынная музыч-ная школа “Гармонія”, з праграмай “З музыкай у сэрцы” – калектывы Палаца культуры Мінскага трактарнага завода, “Музычны калейдаскоп” прадставіла сярэдняя школа
№ 133 [74].

Серыю канцэртаў для мінскіх школьнікаў падрыхтава-лі *Нацыянальны акадэмічны аркестр Беларусі імя І. Жы-новіча і філармонія для дзяцей і юнацтва*. Акцыя-фесты-валь *“Нам не забыцца той вайны”*, прысвечаная 60-годдзю Вялікай Перамогі, доўжылася з сярэдзіны сакавіка да кан-ца красавіка 2005 г. Праграму канцэртаў склалі творы бе-ларускіх кампазітараў: І. Любана, Дз. Смольскага, Л. Зах-леўнага, У. Алоўнікава і інш. Кампазіцыі гучалі ў такой паслядоўнасці, каб спачатку слухачы як бы перанесліся ў даваенны Мінск, потым пераджылі цяжкія ваенныя часы, а затым удзельнічалі ў адраджэнні з руін нашай сталіцы. Дарэчы, прэм’ера праграмы “Нам не забыцца той вай-ны” адбылася ў дзень 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Тады ў ёй прымалі ўдзел салісты Беларускай дзяржаўнай філармоніі, Нацыянальны акадэмічны народны аркестр Беларусі імя І. Жыновіча, Дзяржаўны камерны хор, салістка Дзяржаўнага музычнага тэатра Беларусі Н. Гайда [53].
Створаны 17 гадоў таму *канцэртны ансамбль скрыпа-чоў* пад кіраўніцтвам У. Перліна Рэспубліканскай гімназіі-каледжа пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі пад-рыхтаваў да 60-годдзя Вялікай Перамогі канцэрт *“Памяць сэрца”*, у якім гучалі класічныя творы В.-А. Моцарта, П. Чайкоўскага, Г. Свірыдава, І. Штрауса, творы беларускіх кампазітараў, мелодыі ваеннага часу. 5 мая 2005 г. у Цэнт-ральным доме афіцэраў адбыўся дабрачынны канцэрт для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны [62].

У Галоўным ваенным клінічным шпіталі Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь адбыўся канцэрт навучэнцаў дзіцячай музычнай школы № 10 імя Я. Глебава, прысвечаны знамя-нальнай даце, у якім прагучалі музычныя нумары, песні, літаратурны мантаж з твораў, прысвечаных салдатам-пера-можцам Вялікай Айчыннай вайны [63].

7 красавіка 2004 г. у Цэнтральным Доме афіцэраў ад-быўся *святочны канцэрт заслужанага калектыву Рэспуб-лікі Беларусь узорна-паказальнага аркестра Узброеных сіл краіны,* прысвечаны 60-годдзю

вызвалення Беларусі ад ня-мецка-фашысцкіх захопнікаў. У рэпертуары аркестра – кла-січная і эстрадная музыка, патрыятычныя творы (у іх ліку – песні аб арміі, якія сумесна з беларускімі паэтамі напісаў мастацкі кіраўнік аркестра палкоўнік А. Фёдараў).

Вясной 2004 г. у Цэнтральным Доме афіцэраў адбыўся заключны *канцэрт лаўрэатаў VII Усеармейскага тэлеві-зійнага фестывалю салдацкай песні*, прысвечаны 60-год-дзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Юбілею Вялікай Перамогі быў прысвечаны *IV Міжна-родны фестываль патрыятычнай песні "Афганистан бо-лит в душе моей"*, які адбыўся ў маі 2005 г. у Віцебску.

Знамянальнай даце прысвечана новая праграма *кан-цэртна-эстраднага аркестра Гомельскай абласной філар-моніі* пад кіраўніцтвам заслужанага артыста Беларусі
Ю. Васілеўскага. Праграму складаюць песні аб вайне, напі-саныя нашымі сучаснікамі. Для ветэранаў Вялікай Айчын-най вайны аркестр праводзіў дабрачынныя канцэрты.

31 сакавіка 2004 г. у канцэртнай зале Віленскай бібліят-тэкі імя А. Міцкевіча (Літва) прайшоў канцэрт лаўрэатаў міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў, салісткі Бела-рускай дзяржаўнай філармоніі *Н. Цішко* і канцэртмайстра *Т. Вішняковай.* Культурная акцыя была прысвечана 60-год-дзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопні-каў. Праграму канцэртнага выступлення склалі больш за дваццаць пяць твораў разнастайных музычных жанраў. У выкананні нашых артыстаў прагучалі класічныя творы, створаныя вядомымі беларускімі і замежнымі кампазітара-мі: Л. ван Бетховенам, П. Чайкоўскім, Дж. Кернам, Ю. Се-мянякам, І. Лучанком, а таксама рамансы і беларускія на-родныя песні. Большая частка канцэрта была прысвечана ваенна-патрыятычнай тэматыцы.

6 чэрвеня 2004 г. у *г. Портсмут (Вялікабрытанія)* у межах штогадовага фестывалю ваеннай музыкі адбыўся *канцэрт Узорна-паказальнага аркестра ўнутраных войск МУС Рэспублікі Беларусь*. Канцэрт быў прымеркаваны да 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх за-хопнікаў і адкрыцця Другога фронту.
Праграма канцэрта, у якую ўвайшлі музычныя творы беларускіх,

савецкіх і брытанскіх аўтараў, мелодыі часоў Вялікай Айчыннай вайны, а таксама іншыя творы, атры-мала гарачую падтрымку гледачоў.
На працягу мая – чэрвеня 2004 г. Узорна-паказальны аркестр унутраных войск МУС Рэспублікі Беларусь даў больш за 20 канцэртаў у Злучаным Каралеўстве Вяліка-брытаніі і Паўночнай Ірландыі, а таксама ў Рэспубліцы Ірландыя [16].

27 чэрвеня 2004 г. *Пасольства Беларусі ў Ізраілі* су-месна з *Міжнародным цэнтрам культурных сувязей "Ізра-іль–Беларусь"* правяло ў г. Ашдодзе святочны канцэрт, прысвечаны 60-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На канцэрте прысутнічалі ветэра-ны, якія вызвалялі Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны, выхадцы з Беларусі, якія жывуць сёння ў Ізраілі, прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, вядомыя палітыч-ныя і грамадскія дзеячы Ізраіля. У канцэрце бралі ўдзел вядомыя ізраільскія выканаўцы, сярод якіх былі ўладаль-нік Гран-пры Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Сла-вянскі базар у Віцебску" спявак Рафаэль, артыст Ян Левін-зон, музыкант У. Фрыдман, шэраг выканаўцаў – лаўрэатаў міжнародных конкурсаў. У канцэрце сярод іншых твораў прагучалі і папулярныя беларускія песні [61].

* * *

З цягам часу падзеі Вялікай Айчыннай вайны аддаля-юцца ад нас усё далей і далей, і ўсё менш застаецца сярод нас жывых удзельнікаў вайны. Захавальнікам і абуджаль-нікам памяці, здатным зафіксаваць і адлюстраваць веліч подзвігу народа, з'яўляецца мастацтва. Сёння адбываецца новае асэнсаванне гераічных падзей мінулага з улікам рэа-лій сучаснай рэчаіснасці, але, пры ўсёй розніцы ў падыхо-дах да тэмы, старэйшае і маладзейшае пакаленне яднаюць адносіны да Айчыны, да падзей Вялікай Айчыннай вайны як агульначалавечай трагедыі, якая асэнсоўваецца праз персанальную гісторыю асобных лёсаў.

*Мазура В.Я., галоўны бібліёграф АНІКМ*
*Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

ЛІТАРАТУРА

1. ***Алов В.*** Драмтеатру Белорусской армии аплодировали в Москве // Во славу Родины. 2005. 10 мая.

2. ***Андронов К.*** Большая мечта лейтенанта Володьки / Бесе-довала И. Бурак // Во славу Родины. 2004. 1 дек.
3. ***Арлова Т.*** Супадзенні па групе крыві: “Я твая нявеста” паводле В. Астаф’ева ў Магілёўскім абласным драматычным тэат-ры // Мастацтва. 2005. № 5. С. 14–15.
4. ***Ахремчик Т.*** Театр “в погонах” // Нар. газ. 2004. 21 ліп.
5. ***Барабаншчыкава В.*** Адраджэнне “Трыбунала” // Настаўн. газ. 2005. 19 мая.
6. ***Барабаншчыкава В.*** Вайна на іх не забылася // Настаўн. газ. 2004. 18 мая.
7. ***Барабаншчыкава В.*** З ім была вайна // Настаўн. газ. 2004. 23 кастр. С. 7.
8. ***Барабаншчыкава В.*** Пра каханне, што перамагае смерць // Настаўн. газ. 2004. 27 крас.
9. ***Баркоўскі В.*** Плошча Перамогі Віталя Баркоўскага / Гута-рыла Т. Катовіч // Настаўн. газ. 2004. 23 кастр. С. 7.
10. ***Бегун Н.*** “И помнит мир спасенный” // Мин. курьер. 2005. 31 марта. С. 2.
11. ***Бегун Н.*** На сцэне і на экране // Мин. курьер. 2004.
29 июня. С. 7.
12. ***Белоусов О.*** Отвага – родная сестра мастерства // Сов. Белоруссия. 2004. 22 окт. С. 23.
13. ***Берасцень С.*** У незабыўных гуках музыкі // ЛіМ. 2005. 22 крас. С. 2.
14. ***Береснева О.*** Театр во славу Родины: К 60-летию осво-бождения Беларуси в Минске появится новый драматический театр – Белорусской армии // Мин. курьер. 2004. 13 апр. С. 4.
15. ***Береснева О.*** “Ты помнишь, Алеша?” // Мин. курьер. 2004. 29 июня. С. 7.
16. ***Больш*** за 20 канцэртаў // Культура. 2004. 12–18 чэрв. (№ 24). С. 19.
17. ***Булгакова В.*** Премьера: Там было все! // Биржа инфор-мации (Гродно). 2004. 21 окт. С. 2.
18. ***Бунцэвіч Н.*** Аркестравыя “мадуляцыі” // Культура. 2005. 26 лют. – 4 сак. (№ 9). С. 2.
19. ***Бяспалы А., Грыцэўскі У.*** Чалавек на вайне / Гутарыў
Р. Альшэўскі //Культура. 2004. 3–9 ліп. (№ 27). С. 20.
20. ***Васькун И.*** Откроем заново “Альпийскую балладу”?.. // Бел. деловая газ. 2004. 18 мая. С. 14.
21. ***Вітаем*** новыя імёны! // ЛіМ. 2005. 15 крас. С. 1.
22. ***Гольдман С.*** “Датское” искусство – в массы // Бел. дело-вая газ. 2004. 6 июля. С. 14.
23. ***Грамыка Л.*** Запаветнае: “Васілій Цёркін” А. Твардоўска-га ў выкананні Г. Аўсяннікава // Мастацтва. 2005. № 5. С. 18.
24. ***Грамыка Л.*** На чым стаіць светабудова: “Трыбунал”
А. Макаёнка ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі // Мастацтва. 2005. № 5. С. 28–29.
25. ***Гребень И.*** День Победы драматургов // Знамя юности. 2004. 14 мая. С. 18.
26. ***Дашкевіч Г.*** Адзінота ў натоўпе // Витьбичи. 2004.
8 июля.
27. ***Дудараў А.*** Першыя крокі “армейскага” тэатра / Гута-рыла Т. Команава // Культура. 2004. 3–9 ліп. (№ 27). С. 14.

28. ***Дудараў А.*** Тэатр пачынаецца з Перамогі / Гутарыла
Л. Цімошык // Звязда. 2004. 24 чэрв. С. 3.
29. ***Іван*** і Джулія на сцэне Купалаўскага тэатра // Голас Ра-дзімы. 2004. 4–11 сак. (№ 10–11). С. 3.
30. ***Калина Л.*** И война стучалась в души // Гомел. праўда. 2004. 26 июня. С. 5.
31. ***Кармазина С.*** О тех, к кому завтра пришла война // Гро-дзен. праўда. 2004. 9 кастр.
32. ***Команава Т.*** Вайна ці каханне // Культура. 2004. 15–
21 мая (№ 20). С. 7.
33. ***Команава Т.*** Класіка як "лакмусавая паперка" прафесія-налізму // Культура. 2005. 22–28 студз. (№ 4). С. 10.
34. ***Команава Т.*** Наказ // Культура. 2004. 3–9 ліп. (№ 27).
С. 20.
35. ***Команава Т.*** Убачыць…песню // Культура. 2005. 23–
29 крас. (№ 17). С. 7.
36. ***Команава Т.*** Цютчаў, Напалеон, Дзерваед і іншыя: На XII "Славянскіх тэатральных сустрэчах" у Бранску // Культура. 2004. 5–11 чэрв. (№ 23). С. 9.
37. ***Красавин А.*** На сцене театра – "Бобруйский котел" // Веч. Бобруйск. 2004. 25 июня. С. 1.
38. ***Кузнецов П.*** Две новости из жизни одного театра // Веч. Гомель. 2004. 7 окт. С. 5.
39. ***Кустов В.*** Нравственность не созвучна с войной // Весн. Магілёва. 2004. 6 кастр. С. 6.
40. ***Луцэнка Б.*** "Спектаклі пра вайну нельга ставіць дзеля галачкі" / Гутарыў Д. Альшэўскі // Культура. 2005. 14–20 мая (№ 20). С. 3.
41. ***Марадудина Н.*** Навечно в памяти // Веч. Минск. 2004. 25 июня. С. 10.
42. ***Мяшкова Н.*** Горды пачатак // Мін. праўда. 2004.
30 кастр. С. 6.
43. ***Нерядовая*** оценка "Рядовым // "100% (Гомель). 2004.
17 июня. С. 17.
44. ***Нечаева Е.*** И любовь – баллада // Мин. курьер. 2004.
11 мая. С. 5.
45. ***Орлова Т.*** Геннадий – Теркин // Рэспубліка. 2005.
20 крас. С. 12.
46. ***Орлова Т.*** Тебя я услышу за тысячу верст // Рэспубліка. 2005. 28 мая. С. 4.
47. ***Панаскина Т.*** Война и любовь лейтенанта Володьки // Веч. Минск. 2004. 15 окт. С. 3.
48. ***Панаскина Т.*** Первый спектакль Театра Белорусской армии // Веч. Минск. 2004. 24 июня.
49. ***Па-ранейшаму*** кранае "Зямлянка" // Культура. 2004. 10–16 крас. (№ 15). С. 11.
50. ***Пепеляев В.*** Эти песни как букет цветов // Сов. Белорус-сия. 2005. 22 марта. С. 13.
51. ***Пікоўскі Г.*** Гомельшчына маладая // Культура. 2005. 22–28 студз. (№ 4). С. 7.

52. ***План*** мерапрыемстваў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, прысвечаных 60-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне // Культура. 2005. 5–11 лют. (№ 6).
С. 2.
53. ***Полтавская Ю.*** Песни эти забывать нельзя // Мин. курь-ер. 2005. 25 марта. С. 31.
54. ***Попова В.*** Большие гастроли // Сов. Белоруссия. 2004.
1 июня. С. 4.
55. ***Потапенко А.*** Очередной успех на "Славянских встречах" // Гомел. ведомости. 2004. 1 июня. С. 2.
56. ***Рожков М.*** С чего начинается Родина… // Гомел. ведомо-сти. 2004. 9 дек. С. 4.
57. ***Савіцкі У.*** "Толькі калі мы будзем цікавыя самі сабе, нас будуць паважаць і разумець гледачы" / Запісала Л. Грамыка // Мастацтва. 2004. № 7–8. С. 50–51.
58. ***Сандовіч А.*** Хто ідзе на "Трыбунал :"60-годдзю Вялікай Перамогі прысвячаецца // Во славу Родины. 2005. 26 апр.
59. ***Саўко С.*** Між радкоў ваеннай песні // ЛіМ. 2005. 6 мая. С. 10.
60. ***Свирко И.*** Гран-при "Случайному вальсу" // Рэспубліка. 2005. 13 мая. С. 6.
61. ***Святкуе*** Беларусь, святкуе свет! // Культура. 2004. 3–
9 ліп. (№ 27). С. 16.
62. ***Симонова С.*** В музыке – память наших сердец // Во славу Родины. 2005. 28 апр.
63. ***Симонова С.*** …И музыка вместо лекарства // Во славу Родины. 2005. 27 апр.
64. ***Симонова С.*** Крутится пластинка, чуть дрожит игла… // Во славу Родины. 2005. 20 мая.
65. ***Смольский А.*** Новая встреча с Джулией и Иваном // Бел. деловая газ. 2004. 21 апр. С. 14.
66. ***Столярчук К.*** Без конца и без края "Весна"… // Веч. Минск. 2005. 5 апр.
67. ***Сцяпанава Ю.*** З удзелам валанцёраў // ЛіМ. 2005. 6 мая. С. 10.
68. ***Сцяпанава Ю.*** Прэм'ера "Трыбунала" // ЛіМ. 2005.
6 мая. С. 10
69. ***Табе,*** мой родны горад / Н.Б. // Культура. 2004. 3–9 ліп. (№ 27). С. 17.
70. ***Тапстова А.*** Премьера о любви и смерти // Знамя юно-сти. 2004. 1 окт. С. 19.
71. ***Телешева А.*** Музыкальные вечера с Президентским ор-кестром // Рэспубліка. 2005. 17 лют. С. 1.
72. ***Цяльцеўская Ю.*** "Лейтэнант Валодзька" на сцэне // Нар. воля. 2004. 9 кастр.
73. ***Чатыры*** актуальныя пытанні // Культура. 2005. 2–8 крас. (№ 14). С. 3.
74. ***Шикуть О.*** С музыкой в сердце // Мин. курьер. 2005.
25 марта. С. 4.
75. ***Шмыгин А.*** Турне Президентского оркестра // Во славу Родины. 2004. 11 июня.
76. ***Шурховецкий В.*** С днем рождения, военный театр! // Во славу Родины. 2004. 23 июня.

77. ***Щедрина О.*** До главных премий не дотянули // Мин. курьер. 2004. 4 мая. С. 7.
78. ***Щербаченя Н.*** Первый спектакль армейского театра // Рэспубліка. 2004. 23 чэрв. С. 2.
79. ***Юсубова Н.*** Повесть о юности, или “Завтра была война” // Веч. Гродно. 2004. 24 нояб. С. 25.
80. ***Яднае*** памяць аб Вялікай Перамозе // Культура. 2003. 13–19 верас. (№ 37). С. 2.
81. ***Ященко Дм.*** Музы Несвижа // Обозреватель. 2005.
29 апр. С. 7.